**Н. А. Ляйко**,
*прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт;*
**А. І. Фядорына**,
*дацэнт кафедры інфармацыйных рэсурсаў*

# АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ «КАТАЛАГІЗАЦЫЯ ДАКУМЕНТАЎ»: СУЧАСНЫ СТАН І ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ

«Каталагізацыя дакументаў» – гэта дысцыпліна, якая даўно выкладаецца на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый. За гэты час змянялася не толькі назва дысцыпліны («Бібліятэчныя каталогі», «АСАД», «Каталагізацыя дакументаў»), але і яе напаўненне, што абумовіла неабходнасць перагляду форм навучання.

Выкладанне дысцыпліны «Каталагізацыя дакументаў» ажыццяўляецца трыма спосабамі: франтальны (лекцыі); франтальна-індывідуальны (семінарскія, практычныя, лабараторныя заняткі); дробнагрупавыя заняткі.

У Дзяржаўнай праграме развіцця вышэйшай адукацыі на 2011–2015 гг. [5] значная ўвага ўдзяляецца якасці вышэйшай адукацыі за кошт ўдасканалення арганізацыйнага і навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу. У сувязі са скарачэннем значнай колькасці вучэбных гадзін і пераходам на самастойную работу асаблівае значэнне надаецца падрыхтоўцы падручнікаў, вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, навукова-метадычнаму забеспячэнню.

Па дысцыпліне «Каталагізацыя дакументаў» усе вышэйзгаданыя матэрыялы падрыхтаваны. Выдана тыпавая вучэбная праграма па (2011), створаны вучэбна-метадычны комплекс, які штогод аднаўляецца. Дысцыпліна забяспечана вучэбнымі дапаможнікамі («Каталагізацыя дакументаў. Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне» (2007); «Каталагізацыя дакументаў. Індэксаванне дакументаў» (2011); «Каталагізацыя дакументаў. Арганізацыя бібліятэчных каталогаў як інфармацыйна-пошукавых сістэм» (2013). На жаль, забеспячэнне ўсёй неабходнай вучэбна-метадычнай дакументацыяй і вучэбнымі выданнямі не прынесла жадаемых вынікаў. Экзаменацыйныя адзнакі, як і ў мінулыя гады, сярэднестатыстычныя. Таму пасля экзамена праведзена анкетаванне, якое дазволіла выявіць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адносіны студэнтаў да выкладаемай дысцыпліны, вызначыць праблемы засваення пэўных раздзелаў і выканання самастойнай работы, задаволенасць студэнтаў вучэбнай і метадычнай літаратурай, адносіны студэнтаў да прафесіі бібліятэкара, вытворчай практыкі і інш.

Веды, якія атрыманы студэнтамі пры вывучэнні дадзенай дысцыпліны, неабходны ім у бібліятэцы на любым этапе работы. Гэта студэнты заўважылі ў час вытворчай практыкі. Таму адказам на пытанне «Якое значэнне мае дысцыпліна “Каталагізацыя дакументаў” для прафесійнай падрыхтоўкі?» (у балах) былі высокія адзнакі. Аб гэтым сведчыць звесткі табліцы 1.

*Табліца 1*

| Балы | Колькасць працэнтаў |
|---|---|
| 10 | 27,9 % |
| 9 | 27,9 % |
| 8 | 27,9 % |
| 7 | 7,0 % |
| 6 | 4,65 % |
| 5 | 4,65 % |

Прыведзеная вышэй табліца паказвае адносіны студэнтаў да выкладаемай дысцыпліны. Тыя, хто разумеюць яе неабходнасць у бібліятэцы і паставілі адзнакі «7», «8», «9», «10», складаюць разам 90,7 %. У адной з анкет не толькі была абведзена лічба «10», але і побач напісана «это не лесть». Адзнакі «5» і «6» разам складаюць 9,3 %. Безумоўна, нас парадавала, што пасля экзамена і вытворчай практыкі студэнты далі такую высокую ацэнку неабходнасці вывучэння дадзенай дысцыпліны.

Пры адказе на пытанне «Якія раздзелы дысцыпліны найбольш цікавыя і неабходныя?» студэнты паказалі сваю дасведчанасць і далі ацэнку раздзелам дысцыпліна, зыходзячы з сучасных патрабаванняў да прафесіі бібліятэкара і практычнай дзейнасці бібліятэк. 9,3 % звярнулі ўвагу на тое, што ўсе раздзелы неабходны ў паўсядзённай дзейнасці бібліятэк. Сярод самых цікавых і неабходных пералічаны: «індэксаванне дакументаў» (сістэматызацыя і прадметызацыя), «табліцы УДК і ББК» – 41,7 %, фарміраванне бібліяграфічнага запісу і BELMARC – 20,8 %, арганізацыя бібліятэчных каталогаў – 2,3 %. Не адказалі на гэта пытанне 26,9 % студэнтаў.

Адказваючы на пытанне анкеты «Якія раздзелы дысцыпліны аказаліся найбольш складанымі пры вывучэнні і выкананні са-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастойнай работы?», студэнты адзначылі індэксаванне дакументаў па УДК і прадметызацыю – 41,7 %; фарміраванне традыцыйнага і машыначытальнага бібліяграфічнага запісу – 39,5 %; арганізацыю бібліятэчных каталогаў – 14,1 %. Не адказалі на гэта пытанне – 4,7 %.

На наш погляд, адказ на пытанне «На якія раздзелы дысцыпліны адведзена недастаткова гадзін?» быў абгрунтаваны папярэднім адказам. У першую чаргу, лічаць студэнты, неабходна павялічыць колькасць гадзін на індэксаванне дакументаў (сістэматызацыю і прадметызацыю) – 41,7 % і фарміраванне бібліяграфічнага запісу, у тым ліку машыначытальнага – 20,9 %, арганізацыю бібліятэчных каталогаў – 11,6 %, на ўсе раздзелы курса – 2,3 %. Не ведалі, што адказаць на гэта пытанне, 23,5 %.

Павышэнне якасці адукацыі ў значнай ступені залежыць ад арганізацыі вучэбнага працэсу. На сучасным этапе сярод найважнейшых задач неабходна выдзеліць наступныя: інтэнсіўны пошук і ўкараненне інавацыйных форм і метадаў навучання; павышэнне вучэбнай матывацыі і фарміраванне ў студэнтаў уменняў і навыкаў самастойнай работы. Вырашэнне праблем у засваенні дысцыпліны залежыць ад яго забеспячэння вучэбнымі і метадычнымі выданнямі, вучэбна-метадычным комплексам (ВМК). Па дысцыпліне «Каталагізацыя дакументаў» намі падрыхтавана ўся неабходная вучэбная і метадычная дакументацыя: тыпавая вучэбная праграма [1], вучэбна-метадычны комплекс, тры вучэбныя дапаможнікі [2–4]. На пытанне «Ці задавальняе вас забеспячэнне дысцыпліны “Каталагізацыя дакументаў” вучэбна-метадычнай дакументацыяй і літаратурай?» (у балах) мы атрымалі наступныя адказы.

*Табліца 2*

| Балы | Колькасць працэнтаў |
|---|---|
| 10 | 20,9 % |
| 9 | 37,2 % |
| 8 | 16,2 % |
| 7 | 11,6 % |
| 6 | 2,3 % |
| 5 | 9,3 % |
| 4 | 2,3 % |

Прыведзеныя звесткі сведчаць аб тым, што студэнты высока ацэньваюць наяўнасць вучэбнай і метадычнай дакументацыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Самымі высокімі баламі пацверджана гэта ацэнка («7», «8», «9», «10»), што складае 86,9 % апытаных. У адной з анкет пастаўлена «10» і ў дужках напісана («пособия Н. А. Лейко и А. И. Федориной всего достататочно»). Адзнакі «5» і «6» складаюць 11,6 %, а адзнака «4» – толькі 2,3 %.

Найважнейшую ролю ва ўдасканаленні арганізацыі вучэбнага працэсу адыгрываюць вучэбныя дапаможнікі. Менавіта яны даюць поўнае ўяўленне аб дысцыпліне, падаюць матэрыял у адпаведнасці з праграмай, у паслядоўнасці вывучэння і засваення. У дапаможніках «Каталагізацыя дакументаў» адлюстроўваецца сучасны стан каталогазнаўства і каталагізацыі дакументаў, паказаны ўзровень патрабаванняў, ведаў і ўменняў да каталагізатараў на сучасным этапе. Таму у анкеце асобна выдзелена пытанне «Ці задаволены Вы нашымі вучэбнымі дапаможнікамі?» Балы спецыяльна не ўказаны. Цікава было даведацца аб думках, заўвагах студэнтаў, зразумець над чым працаваць у будучым. Адказы нас задаволілі: 83,7 % проста пісалі «да, удовлетворен». Але былі і больш дакладныя адказы: «очень хорошие учебные пособия», «достаточно материала для подготовки к экзамену», «в пособиях очень хороший наглядный материал» і г. д. Але былі і заўвагі: 9,4 % студэнтаў прапанавалі нам перакласці дапаможнік на рускую мову; 6,9 % не адказалі на гэта пытанне.

Выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій пры выкладанні і вывучэнні дысцыпліны «Каталагізацыя дакументаў» садзейнічае засваенню студэнтамі не толькі тэарэтычных ведаў, але і ўменняў і навыкаў валодання аўтаматызаванымі тэхналогіямі пры апрацоўцы інфармацыйных рэсурсаў, арганізацыі і выкарыстанні электронных каталогаў. Нас задавальняе, што студэнты гэта разумеюць. Пры адказе на пытанне «Вызначце неабходнасць работы на камп'ютары пры вывучэнні дысцыпліны "Каталагізацыя дакументаў" (у балах) былі атрыманы наступныя вынікі.

*Табліца 3*

| Балы | Колькасць працэнтаў |
|---|---|
| 10 | 32,5 % |
| 9 | 34,9 % |
| 8 | 23,2 % |
| 7 | 4,7 % |
| 5 | 4,7 % |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як бачым, балы «7», «8», «9» і «10» складаюць 95,3 %. І толькі 4,7 % паставілі бал «5».

Цешыць нас і тое, што ў час вытворчай (тэхналагічнай) практыкі, якая звязана з замацаваннем ведаў па дысцыпліне «Каталагізацыя дакументаў», у студэнтаў было мала праблем з выкананнем заданняў. Яны адказвалі, што у час практыкі «даведаліся шмат новага»; ім «спадабалася працаваць у бібліятэцы», «дастаўляюць задавальненне зносіны з чытачамі». Пры адказе на пытанне «Выкананне якіх заданняў вызывала цяжкасці ў час вытворчай практыкі?» большая частка студэнтаў (81,4 %) адказалі, што праблем не было. Асобныя студэнты ўказалі на праблемы з выкананнем заданняў, звязаных з выкарыстаннем рубрыкатара ДРНТІ – 4,7 %; фармата BELMARC – 9,3 %, індэксаваннем дакументаў па УДК – 6,9 %; пошукам у фондзе – 2,3 %; бібліяграфічнай дзейнасцю – 2,3 %.

Для павышэння якасці адукацыі і паглыблення ведаў студэнтаў па дысцыпліне «Каталагізацыя дакументаў», на наш погляд, мэтазгодна:

– павялічыць колькасць праблемных лекцый, у час якіх увагу ўдзяляць матывацыі вывучэння дысцыпліны як неабходнай умовы падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне каталагізацыі;

– павялічыць ролю арганізацыйна-метадычнай падтрымкі, падрыхтаваць практычны дапаможнік па асноўных раздзелах (фарміраванні бібліяграфічнага запісу, індэксаванні дакументаў, арганізацыі як традыцыйных, так і электронных каталогаў) для правядзення практычных, лабараторных і дробнагрупавых заняткаў;

– дапоўніць і шырэй выкарыстоўваць тэставыя заданні;

– вывучэнне дапоўніць дысцыплінай спецыялізацыі «Індэксаванне дакументаў па УДК».


*1.* Інфармацыйныя рэсурсы. Раздзел 2. Каталагізацыя дакументаў : тып. вучэб. праграма для вышэйш. навуч. устаноў па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках) ; склад.: Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына. – Мінск : БДУКМ, 2011. – 30 с.

*2. Ляйко, Н. А.* Каталагізацыя дакументаў. Арганізацыя бібліятэчных каталогаў як інфармацыйна-пошукавых сістэм : вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў устаноў вышэйш. адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках) / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 110 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Ляйко, Н. А.* Каталагізацыя дакументаў. Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне : вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына. – 2-е выд., стэрэатып. – Мінск : БДУКМ, 2007. – 180 с.

4. *Ляйко, Н. А.* Каталагізацыя дакументаў. Індэксаванне дакументаў: вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» вышэйш. навуч. устаноў / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына. – 2-е выд., са змяненнямі. – Мінск : БДУКМ, 2011. – 115 с.

5. Об утверждении Государственной программы развития высшего образования на 2011-2015 годы: постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 1 июля 2011, № 893 // Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2011. – Режим доступа : URL: htt:// pravo.by. – Дата доступа: 08.08.2011.

**Е. А. Марецкий,** *преподаватель кафедры информационных технологий в культуре*

## ЦИФРОВЫЕ ТЕХНОЛОГИИ В ОБРАЗОВАНИИ

Современное общество неразрывно связано с процессом информатизации. Сама жизнь заставляет нас активно использовать информационные технологии в учебно-воспитательном процессе. Одно из приоритетных направлений процесса информатизации современного общества – внедрение средств новых информационных технологий в систему образования. Особенностью современной системы образования является резкое возрастание прямых и обратных потоков информации по всем направлениям. Хранение, обработка, получение, передача, анализ информации, уменьшение бумажного потока посредством компьютерных сетей ускоряет процесс обучения и его эффективность.

Образовательная и информационная среды – близкие, взаимообусловленные явления. Действительно, чтобы получать, анализировать и передавать информацию в современном мире, ориентироваться в действительности, необходимо обладать неким минимальным комплектом знаний и навыков. Научные знания позволяют человеку понять окружающие явления, закономерности и причины событий; а социальные дают представление о структуре общества, нормах поведения, определяют самооценку, возможности и стремления индивида.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ